ПАСТАНОВА
Савета аддзела ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама
ад «___» ____________2017 г. №___
г. Пінск

Аб выніках правядзення сярод бібліятэк
дзяржаўнай установы культуры “Пінская
раённая цэнтралізаваная бібліятэчная
сістэма” раённага агляду-конкурсу на
лепшае тэатралізаванае мерапрыемства
“Нас слова паэта да творчасці кліча”
па творчасці Якуба Коласа

З мэтай азнаменавання 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, народнага паэта Беларусі, грамадскага дзеяча, вучонага, педагога, акадэміка НАН Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, а таксама з мэтай папулярызацыі яго твораў дзяржаўная установа культуры “Пінская раённая цэнтралізованная бібліятэчная сістэма” правяла раённы-агляд конкурс на лепшае тэатралізаванае мерапрыемства “Нас слова паэта да творчасці кліча” па творчасці Якуба Коласа.

У раённам аглядзе-конкурсе на лепшае тэатралізаванае мерапрыемства “Нас слова паэта да творчасці кліча” прынялі ўдзел 39 бібліятэк.

Разглядзеўшы конкурсныя матэрыялы Савет аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прызнаць пераможцамі раённага агляду-конкурсу:
- Валішчанскую сельскую бібліятэку (бібліятэкар Лазюк С. І.) - І месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма”; *за тэатралізацыю вершаванага апавядання Якуба Коласа “За дождж”.*
- Аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц (загадчык аддзелам Самуйлік І. І.) - ІІ месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма”; *за тэатралізацыю вершаванага апавядання Якуба Коласа “Зяць”.*

- Лапацінскую бібліятэку-музей А. Блока (бібліятэкар Дзенісевіч С. М.) - ІІІ месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма”; *за тэатралізацыю ўрыўкаў з кнігі апавяданняў Якуба Коласа “Казкі жыцця”.*

2. Адзначыць граматамі:
- Парахонскую СБ (загадчык аддзелам Лосіч С. П.) *за тэатралізаванае прадстаўленне казкі Якуба Коласа “Дзед і мядзведзь” у выкананні лялечнага гуртка “Татошкі” Парахонскай сельскай бібліятэкі;*
- Бабрыкоўскую СБ (бібліятэкар Міхалевіч А. М.) *за тэатралізаванае прадстаўленне па матывам верша “Песня над калыскай”.*

Старшыня Савета,
начальнік аддзела
ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама Л. В. Галавач